УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ”

УДК 792(476)”159/191”:792.02/.024.035/.036-043.86(043.3)

**ПАГОЦКАЯ**
**АЛЕНА ВІКТАРАЎНА**

# МАСТАЦКА-СТЫЛЯВАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ СЦЭНІЧНАЙ ПРАСТОРЫ І ТЭАТРАЛЬНЫХ ЗБУДАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ КАНЦА XVI – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата мастацтвазнаўства

па спецыяльнасці 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтва

Мінск, 2019

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Работа выканана на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік: | **Корсакава Алена Яўгеньеўна**, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, дэкан факультэта завочнага навучання ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" |
| Афіцыйныя апаненты: | **Смольскі Рычард Баляслававіч,** доктар мастацтвазнаўства, прафесар, галоўны навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела ўстановы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў" |
| | **Лазука Барыс Андрэевіч,** кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, дырэктар Музея старажытнабеларускай культуры дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" |
| Апаніруючая арганізацыя: | **Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт** |

Абарона адбудзецца 20 чэрвеня 2019 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі ўніверсітэта; e-mail: buk@buk.by; тэлефон вучонага сакратара: 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

Аўтарэферат разасланы 20 мая 2019 г.

В.а. вучонага сакратара
савета па абароне дысертацый
доктар філалагічных навук, прафесар А. У. Марозаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

На мяжы XX – XXI стагоддзяў адбываецца працэс пераасэнсавання гістарычнай спадчыны мастацтва і, у першую чаргу, яго мастацка-стылявой эвалюцыі. Разуменне гэтага працэсу спрыяе ўспрыняццю мастацтва як мінулых часоў, так і новых плыняў і накірункаў. Важна ацаніць не толькі сам гістарычны матэрыял розных відаў мастацтва, але і сродкі яго інтэрпрэтацыі ў сучаснай мастацкай культуры. Тэндэнцыі збліжэння, узаемапранікнення і ўзбагачэння розных стыляў і напрамкаў мастацтва найбольш яскрава праявіліся ў архітэктуры і тэатральным мастацтве.

Даследаванне сінтэзу тэатральнай архітэктуры і сцэнаграфіі ў рэчышчы існаваўшых мастацкіх стыляў і напрамкаў дазваляе паказаць беларускае мастацтва як частку еўрапейскай культуры і вызначыць яго самабытныя рысы. З канца XVI стагоддзя беларускае мастацтва ўваходзіць у агульны кантэкст еўрапейскага мастацкага працэсу і да пачатку XX ст. стылі Заходняй Еўропы аказваюць непасрэдны ўплыў на фарміраванне нацыянальнага беларускага мастацтва. Менавіта ў акрэслены перыяд, калі адбываецца працэс станаўлення нацыянальнай архітэктуры і тэатра, сфарміраваліся кананічныя формы сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў, якія захавалі сваю структуру і змест на працягу стагоддзяў.

Актуальнасць даследавання вызначана неабходнасцю сучаснай ацэнкі стылявых з’яў у дынаміцы спалучэння сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў, улічваючы іх інтэрнацыянальны характар. Архітэктура як стылестваральны від мастацтва адлюстроўвае ў тэатральных збудаваннях працэс развіцця стылю, а тэатр, які з’яўляецца люстэркам грамадства, ў сцэнічнай прасторы паказвае спецыфіку жыцця і нораваў канкрэтнай эпохі.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

***Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі***

Дысертацыйнае даследаванне выканана ў межах навукова-даследчых тэмаў кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”: “Кампаратывізм у сучасным мастацтве як навуковы падыход і творчы метад” (зацверджана на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 09.12.2006, пратакол № 6), “Беларускае мастацтва XX стагоддзя ва ўмовах глабалізацыі: кампаратыўны аналіз” (зацверджана на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21.12.2010, пратакол № 10), “Інтэрпрэтацыя вобраза творчай асобы ў беларускім мастацтве XX – XXI стагоддзяў: кампаратыўны падыход” (зацверджана на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 22.12.2015, пратакол № 4).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Мэта і задачы даследавання***

*Мэта даследавання* – выявіць мастацка-стылявыя асаблівасці эвалюцыі сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў у Беларусі канца XVI – пачатку XX стагоддзя.

Для дасягнення пастаўленай мэты вызначаны наступныя *задачы*:

– вызначыць сутнасць азначэння і арганізацыі сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў;

– ахарактарызаваць увасабленне прынцыпаў стыляў барока і ракако ў сцэнічнай прасторы і тэатральных пабудовах Беларусі;

– раскрыць мастацкую спецыфіку класіцызму ў тэатральнай архітэктуры і дэкарацыйным мастацтве Беларусі;

– абазначыць асноўныя тэндэнцыі праяўлення стылявой эклектыкі ў сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаваннях канца XIX – пачатку XX стагоддзя.

***Навуковая навізна***

Дысертацыйнае даследаванне выканана аўтарам самастойна і ўяўляе сабой першае ў беларускім мастацтвазнаўстве комплекснае даследаванне сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў у кантэксце мастацка-стылявой эвалюцыі. Архітэктура і сцэнаграфія разглядаюцца як адзінае сінтэтычнае цэлае ў рэчышчы пануючых мастацкіх стыляў і напрамкаў канца XVI – пачатку XX стагоддзя (барока, ракако, класіцызму, эклектыкі, мадэрну). Навуковая значнасць вынікаў заключаецца ў тым, што ў дысертацыі вызначана сутнасць і асаблівасці арганізацыі сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў; абгрунтаваны прынцыпы стыляў барока і ракако і іх увасабленне ў сцэнічнай прасторы і тэатральнай архітэктуры Беларусі; раскрыта мастацкая спецыфіка класіцызму ў тэатральных збудаваннях і дэкарацыйным мастацтве Беларусі, акрэслены асноўныя тэндэнцыі праяўлення стылявой эклектыкі канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Вынікі даследавання пашыраюць праблемнае поле сучаснага мастацтвазнаўства.

***Палажэнні, якія выносяцца да абароны***

1. Сцэнічная прастора з’яўляецца месцам стварэння і бытавання мастацкага вобраза спектакля і заснавана на сінтэзе рэальнай трохмернай і ілюзорнай прасторы. Кампазіцыйнае вырашэнне сцэнічнай прасторы залежыць ад мастацкага вобраза спектакля. Прастора складаецца з дэкарацый, асвятлення, машынерыі, касцюма, грыма і музычнага афармлення. На фарміраванне сцэнічнай прасторы непасрэдны ўплыў аказвае мастацка-стылявая эвалюцыя эпохі. У залежнасці ад дамінуючага мастацкага стылю ці напрамку сцэнічная прастора пры перадачы драматургічнай канцэпцыі і фарміраванні мастацкіх вобразаў можа заставацца няйтральнай, ці адлюстроўваць канкрэтнае асяроддзе. Тэатральнае збудаванне – гэта архітэктурная пабудова, прызначаная для правядзення тэатралізаваных дзей і прадстаўленняў, якая садзейнічае прастораваму вырашэнню сцэнічнага твора і складаецца з прасторы сцэны і глядзельнай залы. Тэатральныя збудаванні ўяўляюць сабой асобныя будынкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пабудовы, а таксама іх комплексы. Канструкцыйныя і дэкаратыўныя асаблівасці іх залежаць ад дамінуючага мастацкага стылю.

2. З канца XVI па XVIII ст. на беларускіх землях пануе барока – мастацкі стыль, які храналагічна супадае з заходнеўрапейскім, але мае сваю нацыянальную спецыфіку. Фарміраванню тагачаснай сцэнічнай прасторы спрыяе дзейнасць народнага тэатра, батлейкі і асабліва школьнага тэатра. Асноўныя прыёмы сцэнаграфіі (тэларыйныя і кулісныя дэкарацыі, спецыяльныя касцюмы і асвятленне, ужыванне рэквізіту) выпрацоўваюцца ў школьным тэатры і атрымліваюць далейшае развіццё на прыватнаўласніцкай тэатральнай сцэне. Для архітэктуры барочных тэатральных збудаванняў характэрны дынамізм, пышнасць, дэкаратыўнасць, выкарыстанне ракайльнага арнаменту. Тэатралізацыя як адзін з асноваўтваральных прынцыпаў стылю спрыяла фарміраванню сцэнічнай культуры і выхаду сцэнічнай прасторы за межы тэатральнай залы, ахопліваючы ўсё навакольнае асяроддзе.

3. Мастацкая спецыфіка класіцызму (дакладнасць, строгасць, простыя лініі, выкарыстанне архітэктурнага ордэра, дэкаратыўных калон, імкненне пераймаць ідэалы старажытнасці) адбілася на вонкавым выглядзе збудаванняў, на сцэнічнай пляцоўцы, на тэатральным касцюме і паводзінах акцёраў на сцэне. На фарміраванне сцэнічнай прасторы асаблівы ўплыў аказаў класіцыстычны канон, які быў распрацаваны ў заходнееўраепейскім тэатральным мастацтве: адзінства часу, месца, дзеяння, адзіная сюжэтная лінія, выяўленне істотных тыпалагічных рысаў і адмова ад індывідуальных прыкмет. На тэрыторыі Беларусі асаблівасці класіцызму (сінтэз з барока, спалучэнне заходнееўрапейскіх і рускіх тэндэнцый) тлумачацца тым, што ён не прышоў на змену барока, а існаваў побач з ім, таму творы мастацтва канца XVIII – першай паловы XIX ст. характарызуюцца спалучэннем матываў барока і строгага класіцызму.

4. У другой палове XIX – пачатку XX ст. характэрны разнастайныя варыянты існавання стыляў, накірункаў і плыняў: неарэнесанс, неарускі, неавізантыйскі стыль, эклектыка, мадэрн. Тэатральнае мастацтва ў гэты час набывае ўсё большую распаўсюджанасць, яно становіцца папулярным сярод шырокіх колаў гледачоў. З'яўляецца вялікая колькасць самадзейных калектываў, для якіх мастацкае афармленне сцэнічнай прасторы не мае важнага значэння. У афармленні сцэнічнай прасторы пануе стылявая эклектыка. Дэкарацыйнае афармленне гэтага перыяду амаль не развіваецца, тэатральныя трупы здавольваюцца тыпавымі дэкарацыямі, якія вандруюць з аднаго спектакля ў другі. Для тэатральных відовішчаў часта прыстасоўваюць залы гарадскіх памяшканняў. У той жа час з'яўляюцца тыпавыя праекты тэатральных будынкаў, якія становяцца дамінантай горада, цэнтрамі гарадскога жыцця. Праявы новага стылю мадэрн на мяжы XIX – XX стагоддзяў знайшлі сваё адлюстраванне ў шматлікіх праектах кіна-і электратэатраў, цыркаў, сучасных формаў тэатраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Асабісты ўклад саіскальніка***

Поўны аб'ём дысертацыйнай работы з'яўляецца вынікам асабістых даследаванняў саіскальніка. У дысертацыі ўпершыню сцэнічная прастора і тэатральныя збудаванні разглядаюцца ў кантэксце эвалюцыі асноўных стыляў і плыняў. Асабісты ўклад саіскальніка заключаецца ў тым, што ў дысертацыі абгрунтавана паняцце сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў; даецца гістарычны экскурс развіцця відаў, форм і тыпаў тэатральных збудаванняў; ахарактарызавана праяўленне стыляў барока і ракако ў сцэнічнай прасторы Беларусі; азначана спецыфіка класіцызму ў тэатральнай архітэктуры і дэкарацыйным мастацтве Беларусі; вызначана сутнасць стылявой эклектыкі ў фарміраванні сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў канца XIX – пачатку XX ст. Вынікі праведзенага даследавання пашыраюць праблемнае поле сучаснай мастацтвазнаўчай навукі, адкрываюць новыя шляхі асэнсавання і практычнага выкарыстання мастацкіх стыляў у фарміраванні сцэнічнай прасторы і афармленні тэатральных збудаванняў.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыі***

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання прайшлі апрабацыю на 17 навуковых і навукова-практычных канферэнцыях міжнароднага (14) і рэспубліканскага (3) узроўняў: Навукова-метадычная канферэнцыя "Сацыяльна-гуманітарныя навукі ў сістэме вышэйшай школы" (Мінск, БДУК, 5–6 лютага 2002 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя "Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі" (Мінск, БДУК, 25–26 сакавіка 2003 г.); XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, БДУКМ, 24–26 мая 2005 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Культура. Навука. Творчасць" (Мінск, БДАМ, 19–20 красавіка 2007 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Таленавітыя жанчыны Беларусі ў культурнай, навуковай і мастацкай прасторы свету" (Мазыр, МДПУ імя І. П. Шамякіна, 24–25 мая 2007 г.); XV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, БДУКМ, 21–24 мая 2009 г.); IV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Культура. Навука. Творчасць" (Мінск, БДУКМ, 22–23 красавіка 2010 г.); XVI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, БДУКМ, 26–28 мая 2010 г.); Навуковая канферэнцыя, прысвечаная 35-годдзю БДУКМ "Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі" (Мінск, БДУКМ, 3 снежня 2010 г.); II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Актуальныя праблемы мастацтва: гісторыя, тэорыя, методыка" (Мінск, БДПУ, 7–8 красавіка 2011 г.); XIX Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, БДУКМ, 22–24 мая 2013 г.); VIII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Культура. Навука. Творчасць" (Мінск, БДУКМ, 15 мая 2014 г.); Навуковая канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага складу БДУКМ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва” (Мінск, БДУКМ, 25 лістапада 2015 г.); IX Міжнародная навуковая канферэнцыя “Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання” (Мінск, БДУКМ, 24 – 26 красавіка 2015 г.); X Міжнародная навуковая канферэнцыя “Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання” (Мінск, БДУКМ, 29–30 красавіка 2016 г.); V Міжнародная завочная навукова-практычная канферэнцыя “Культура: адкрыты фармат – 2015” (Мінск, БДУКМ, 15 чэрвеня 2015); XII Міжнародная навуковая канферэнцыя “Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання” (Мінск, БДУКМ, 27–29 красавіка 2018 г.).

***Апублікаванасць вынікаў дысертацыі***

Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 25 публікацыях: 6 артыкулах у рэцэнзаваных навуковых часопісах (2 аўт. арк.), 7 – у зборніках навуковых работ (1,5 аўт. арк.), 12 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (3,5 аўт. арк.). Агульны аб’ём публікацый складае 7 аўтарскіх аркушаў.

***Структура і аб’ём дысертацыі***

Структура дысертацыі абумоўлена логікай выкладання матэрыялу і складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і дадатка. Поўны аб’ём дысертацыі складае 248 старонак, з якіх 162 старонкі займае асноўны тэкст, 26 старонак – бібліяграфічны спіс, які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (295 назваў на беларускай, рускай, польскай і англійскай мовах) і спіс публікацый саіскальніка (25 назваў на беларускай і рускай мовах). Дысертацыю дапаўняюць тры дадаткі, якія займаюць 59 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваецца выбар тэмы даследавання, яе сувязь з навуковымі праграмамі і тэмамі, вызначаюцца мэты і задачы, навуковая навізна, фармулююцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца да абароны, вызначаецца асабісты ўклад саіскальніка, адлюстроўваецца апрабацыя вынікаў даследавання і колькасць надрукаваных работ, структура і аб’ём дысертацыі.

Глава 1 **“Гісторыка-тэарэтычны аспект вывучэння сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў”** уключае тры раздзелы, якія адлюстроўваюць ступень распрацаванасці заяўленага ў дысертацыі праблемнага поля і прысвечаны выяўленню асноўных змястоўна-стылявых тэндэнцый развіцця беларускага мастацтва канца XVI – пачатку XX стагоддзя.

У раздзеле 1.1 **“Сцэнічная прастора і тэатральныя збудаванні ў кантэксце аналітычнага агляду літаратуры. Метадалогія даследавання”** вызначаецца ступень распрацаванасці тэмы, даецца агляд крыніц, прысвечаных асобным пытанням сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў, выяўляюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пытанні, якія засталіся нявырашанымі, вызначаецца месца даследавання ў распрацоўцы дадзенай праблематыкі, абгрунтоўваюцца выкарыстаныя ў рабоце метады даследавання.

Першыя даследаванні, звязаныя з вывучэннем сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў, з'явіліся ў эпоху Антычнасці, але закраналі яны толькі асаблівасці абсталявання архітэктурных пабудоў, планіроўкі, акустыкі, дэкарацый і касцюмаў. Паступова ўвага даследчыкаў звярнулася да вывучэння тэорыі і практыкі тэатральнага будаўніцтва, напрамкаў развіцця мастацкага афармлення сцэнічнай прасторы, творчасці асобных архітэктараў і мастакоў тэатра: М. Герман, Ф. Ланг, А. Паладыё, С. Серліо, І. Фуртэнбах і інш. Значную ролю ў станаўленні тэатразнаўства адыгралі тэарэтычныя распрацоўкі практыкаў тэатра А. Апіа, П. Брука, Э. Г. Крэга, П. Паві, М. Рэйнхардта, Ё. Свободы і інш.

Маштабныя і фундаментальныя працы па гісторыі заходнееўрапейскага і рускага тэатра, якія сталі асновай мастацтвазнаўчых даследаванняў у XX стагоддзі, былі створаны А. Анікстам, Г. Баяджыевым, А. Гвоздзевым, С. Данілавым, А. Джывялегавым, С. Ігнатавым, С. Макульскім, У. Усеваладскім-Гернгросам і інш. Звесткі аб гісторыі стварэння і асаблівасцях абсталявання тэатральных збудаванняў і сцэнічнай прасторы, асвятлення, канструявання дэкарацый знаходзяцца ў работах расійскіх архітэктараў, даследчыкаў, тэарэтыкаў XX ст. В. Базанава, Г. Бархіна, В. Быкава, В. Ванслава, В. Вінаградава, Н. Ізвекава, А. Косцінай і Ф. Сыркінай. Значным унёскам у развіццё мастацтвазнаўства на сучасным этапе сталі працы даследчыкаў архітэктуры тэатральных будынкаў, тэхнікі і тэхналогіі сцэны В. Бярозкіна і В. Шапавалава.

Беларускія землі на працягу стагоддзяў уваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, таму ў многіх даследаваннях беларускі тэатр разглядаецца як частка заходнееўрапейскай, у прыватнасці, польскай культуры, таму каштоўныя матэрыялы па гісторыі тэатральнага мастацтва і архітэктуры ўтрымліваюцца ў даследаваннях польскіх навукоўцаў Р. Афтаназі, С. Бяднарскага, Т. Бранеўскага, Б. Круль-Качароўскай, А. Мілера, А. Цеханавецкага і інш. Значны ўклад у вывучэнне сцэнічнай прасторы беларускіх тэатраў унеслі беларускія мастацтвазнаўцы, гісторыкі, архітэктары Г. Барышаў, Т. Габрусь, А. Грыцкевіч, П. Карнач, А. Корсакава, А. Кулагін, Б. Лазука, Ж. Некрашэвіч-Кароткая, У. Няфёд, А. Сабалеўскі, Р. Смольскі, У. Чантурыя і інш. Комплексныя мастацтвазнаўчыя працы Т. Катовіч, С. Крывашэевай, В. Ярмалінскай, прысвечаныя даследаванню сцэнаграфіі беларускіх тэатраў, закранаюць гісторыю развіцця афармлення беларускай сцэны, але робяць акцэнт на сцэнаграфіі беларускіх тэатраў на мяжы XX – XXI стагоддзяў.

Вывучэнне сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў не мае адзінага агульнапрынятага падыходу да даследавання дадзенай праблематыкі. З пункту гледжання метадалогіі тэма дысертацыі знаходзіцца на перакрыжаванні тэорыі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыі розных відаў мастацтва. Мэта і задачы дысертацыйнага даследавання рэалізуюцца на аснове комплекснага падыходу, які грунтуецца на прынцыпах усебаковасці, гістарызму і аб'ектыўнасці, што дазволіла разглядаць сцэнічную прастору і тэатральныя збудаванні як цэласны комплекс узаемазвязаных кампанентаў у рэчышчы мастацка-стылявой эвалюцыі. Таксама былі выкарыстаны наступныя метады: мастацтвазнаўчага аналізу, гісторыка-культурны, кампаратыўны. Метад мастацтвазнаўчага аналізу спрыяў выяўленню характэрных рыс сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў і дынамікі іх развіцця. Гісторыка-культурны метад дапамог прасачыць эвалюцыю мастацкіх стыляў у гістарычнай рэтраспектыве. Кампаратыўны метад спрыяў вывучэнню спецыфічных праяўленняў мастацкіх стыляў, правядзенню аналогіі з замежным мастацтвам, а таксама супастаўленню сістэмы твораў беларускага і агульнаеўрапейскага мастацтва.

Тэарэтычнай базай для дысертацыйнага даследавання сталі гістарычныя, філасофскія, мастацтвазнаўчыя, культуралагічныя працы па праблемах развіцця мастацтва, выдадзеныя ў другой палове XX – пачатку XXI ст.

Мастацка-стылявая эвалюцыя сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў пакуль не знайшлі адлюстравання ў навуковых пошуках айчынных і замежных даследчыкаў. Аналіз літаратуры паказаў, што даследаванне дадзенага пытання часта носіць апісальны характар. На сённяшні час у мастацтвазнаўстве не існуе адзінага маштабнага даследавання, у цэнтры ўвагі якога стаяла б менавіта пытанне ўзнікнення і развіцця тэатральных памяшканняў, адпаведнага ім афармлення, прынцыпаў арганізацыі сцэнічнай прасторы з канца XVI да пачатку XIX ст. у кантэксце развіцця асноўных стыляў і мастацкіх напрамкаў. Дадзенае даследаванне стала абагульненнем назапашаных за дзесяцігоддзі фактаграфічных звестак, якія дазваляюць увесці беларускі матэрыял у агульнаеўрапейскі кантэкст.

У раздзеле 1.2 **"Сцэнічная прастора і тэатральныя збудаванні: асаблівасці азначэння і арганізацыі"** тэарэтычна абгрунтоўваюцца змястоўныя характарыстыкі сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў.

Асаблівасць азначэння сцэнічнай прасторы патрабуе абгрунтавання навуковай тэрміналогіі і размежавання паняццяў "сцэнічная прастора", "тэатральная прастора", "прастора тэатра", "сцэнаграфічная прастора", "сцэнаграфія", "тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва". Сцэнічная прастора з'яўляецца часткай больш шырокага паняцця "тэатральная прастора", якая аб'ядноўвае разам з сцэнічнай і глядзельную прастору. Ад суадносін гэтых дзвюх частак залежыць і знешні выгляд тэатральнага будынка, і характар пастаноўкі спектакля. На працягу многіх стагоддзяў тэатр выпрабоўваў розныя формы спалучэння дзвюх прастор. У Антычнасці абедзве прасторы былі злучанымі, пазней паміж імі з'явілася партальная раздзяляльная сцяна. Эвалюцыя тэатральнай прасторы цесна звязана з гістарычнымі этапамі развіцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва ў цэлым, і тэатра ў асаблівасці, а таксама залежыць ад нацыянальных, жанравых і іншых рыс.

*Сцэнічная прастора* – гэта месца стварэння і жыцця мастацкага вобраза спектакля, якое ўяўляе сабой сінтэз рэальнай трохмернай прасторы і ілюзорнай прасторы, якая складаецца з дэкарацый, асвятлення, музычнага афармлення спектакля, акцёрскай мовы і пластыкі. Акрамя таго, сцэнічная прастора з'яўляецца месцам умоўнага адлюстравання мастацкіх вобразаў, ад фарміравання якіх залежыць кампазіцыйнае вырашэнне спектакля. Мастацка-стылявая эвалюцыя эпохі непасрэдна ўплывае на фарміраванне сцэнічнай прасторы. У залежнасці ад пануючага мастацкага стылю ці напрамку сцэнічная прастора можа быць нейтральнай і не перадаваць характарыстыку асяроддзя ці, насупраць, адлюстроўваць мясцовы каларыт, асяроддзе і быць месцам эксперыментаў, якія перадаюць драматургічную канцэпцыю і фарміруюць мастацкі вобраз.

Суадносіны рэальнай і ірэальнай сцэнічнай прасторы ў спектаклі адлюстроўвае паняцце "*арганізацыя сцэнічнай прасторы*". Рэальная сцэнічная прастора вызначаецца тэхнічнай насычанасцю сцэны, яе памерамі, характарам архітэктурнай узаемазвязанасці сцэны і глядзельнай залы, што вызначае яе асаблівасці: сцэна-арэна, сцэна-каробка, прасторавая, кальцавая і сімультанная сцэна і г.д. На працягу стагоддзяў узнаўленне менавіта канкрэтных месцаў дзеяння становіцца асноўнай мэтай сцэнічнай творчасці тэатральных мастакоў. Агульная ж эвалюцыя дэкарацыйнага мастацтва вызначаецца рухам да ўсё большай канкрэтнасці сцэнічнага месца дзеяння. Сістэма вобразнага вырашэння сцэнічнай прасторы ўключае элементы, якія абазначаюць яе менавіта як сістэму, служаць пераўвасабленню акцёра, стварэнню ім вобраза таго ці іншага персанажа – дэкарацыі, тэатральны касцюм, грым, рэквізіт, асвятленне, пастановачную тэхніку, архітэктурную зададзенасць тэатра, пластычныя магчымасці акцёрскага складу і інш. Адпаведна ўласная выяўленча-пластычная выразнасць кожнага з элементаў сцэнічна рэалізуецца толькі ў працэсе акцёрскай гульні.

Важнае значэнне для арганізацыі сцэнічнай прасторы спектакля мае архітэктура тэатральнага будынка. Тэатральнае збудаванне – гэта архітэктурная пабудова, прызначаная для правядзення тэатралізаваных дзей і прадстаўленняў, якая складаецца з прасторы сцэны і глядзельнай залы і садзейнічае прастораваму вырашэнню сцэнічнага твора. Эвалюцыя тэатральных збудаванняў цесна звязана з развіццём мастацкіх стыляў. Першыя збудаванні для тэатральных паказаў вядомы са Старажытнай Грэцыі. Яны мелі адкрытую пляцоўку, якая ўпершыню падзялілася на сцэну і месцы для гледачоў. Для стварэння мастацкага вобраза спектакля ў гэты перыяд упершыню выкарыстоўваюцца жывапісныя дэкарацыі і тэатральныя механізмы. У эпоху Старажытнага Рыма з'яўляецца новая форма тэатральнага збудавання – амфітэатр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя пераўтварэнні эпохі Сярэднявечча, калі тэатр знаходзіўся пад непасрэдным уплывам царкоўных дагматаў, былі звязаныя з фарміраваннем новага тыпу дэкарацыі – сімультаннай. Эвалюцыя тэатральнага збудавання ў эпоху Адраджэння прыводзіць да стварэння прынцыпова новай сцэны – закрытай сцэны-каробкі з парталам, які падзяляе сцэну і глядзельную залу. У гэты час з'яўляецца і новы тып афармлення – нязменная архітэктурна-перспектыўная дэкарацыя. У канцы XVI ст. пануючы стыль барока прыносіць пышнасць і дынамізм у структуру сцэны і тэатра ў цэлым. На змену антычнаму амфітэатру прыходзіць шмат'ярусны рангавы тэатр. Пышнасць і дынаміку прадстаўленням надаюць тэларыйная, а пазней кулісна-арачная сістэма дэкарацый і складаная машынерыя. Новы від тэатральнага мастацтва – опера – патрабаваў якаснай акустыкі, што прывяло да змены прамавугольнай формы залы на авальную, падковападобную, якая звужаецца да партала сцэны.

У адпаведнасці з канонамі Класіцызму на сцэну з поўнай праўдападобнасцю пераносяцца вобразы рэальных помнікаў антычнай архітэктуры ці ідэальнай, заснаванай на класічным ордэры. На сцэне перавага надаецца вуглавой перспектыве, якая дае неабмежаваныя магчымасці ілюзіі прасторы і рэльефнасці і строгі, упарадкаваны стыль. У канцы XVIII ст. у сцэнічнай практыцы з'явіўся дэкарацыйны павільён, які стварыў магчымасць для пастаноўкі новага тыпу буржуазнай драмы.

Станаўленне рамантызму спрыяла асваенню рэальнай прасторы сцэны. Дэкарацыя стала аб'ёмнай і рухомай, атрымала магчымасць змяняцца ў працэсе дзеяння шляхам фантастычных пераўвасабленняў. Прыёмы тэатральнай машынерыі і асвятлення былі накіраваны на эмацыянальнае ўздзеянне гледача.

Канец XIX – пачатак XX ст. характарызуецца з'яўленнем натуралізму, які патрабаваў гістарычнай дакладнасці, рэалізму і натуралізму побыту на сцэне. Гэта спрыяла індывідуалізацыі дэкарацый і стварэнню спецыяльнага афармлення да кожнага спектакля.

Сцэнічная прастора і тэатральныя збудаванні кожнай эпохі развіцця тэатра, з аднаго боку, мелі ў кантэксце сваёй культуры толькі ёй характэрныя асаблівасці; з другога – сцэнічная прастора пэўнага перыяду складае толькі частку ў агульнай мастацка-стылявой эвалюцыі развіцця мастацтва.

У раздзеле 1.3 **"Асноўныя змястоўна-стылістычныя тэндэнцыі развіцця беларускага мастацтва канца XVI – пачатку XX стагоддзя"** раскрываецца працэс станаўлення мастацтва ў кантэксце развіцця асноўных стыляў і напрамкаў. Развіццё мастацтва на Беларусі, пачынаючы з канца XVI ст., уяўляла сабой складаны працэс узаемаўплываў розных культурна-гістарычных тэндэнцый, мастацкія стылі фарміраваліся пад уплывам заходнееўрапейскага мастацтва, але набывалі свае нацыянальныя асаблівасці. Пачынаючы з эпохі Барока канца XVI ст. беларускае мастацтва ўваходзіць у агульны заходнееўрапейскі кантэкст.

У беларускай архітэктуры, выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве стыль барока вызначаецца кантрастнасцю ў вырашэнні вобразаў, імкненнем да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

велічнасці і пышнасці, аб’яднаннем у пластычных мастацтвах рэальнага і ілюзорнага, ансамблевасці вырашэнняў. У творах мастацтва перапляталіся сярэдневяковыя і рэнесансныя традыцыі, драматургія і фальклор. Менавіта ў часы барока пачала фарміравацца нацыянальная мастацкая школа. Барока звязвала ў адзінае сінтэтычнае цэлае жывапіс, архітэктуру, літаратуру. Развіццё тэатральных пабудоў адбывалася пад уплывам заходнееўрапейскага дойлідства, а таксама ўсходнеславянскай архітэктуры папярэдніх часоў, на аснове чаго выпрацаваліся мясцовыя мастацкія традыцыі.

У XVIII ст. на фарміраванне мастацтва значны ўплыў аказвае ракако (1725 – 1780 гг.). Магнацкія рэзідэнцыі ў Ружанах, Дзярэчыне, Нясвіжы і г.д. арыентаваліся на заходнееўрапейскія ўзоры (Версаль, Дрэздэн). Для іх характэрныя багацце крывалінейных паверхняў, складанае кампазіцыйнае і каларыстычнае вырашэнне, камернасць. Будынкі адрозніваюцца пластычнасцю аб’ёмаў, маляўнічасцю сілуэта, утворанага шмат’ярусными ажурнымі вежамі, фігурнымі франтонамі, насычанай пластычнай арнаментыкай і скульптурай. Менавіта ў перыяд ракако тэатр становіцца дамінуючым відам мастацтва. Як і ў еўрапейскіх арыстакратычных рэзідэнцыях, прэстыжам магнацкага двара на Беларусі была ўласная акцёрская трупа ці аркестр, пабудова тэатральнага будынка. У гэты час на Беларусі прыватнаўласніцкія тэатры існавалі ў Нясвіжы, Слуцку, Ружанах, Слоніме, Гродне, Глуску, Дзярэчыне, Дуброўне, Шклове, Горы-Горках, Магілёве, Чачэрску, Полацку, Гомелі, Віцебску, Шчорсах, Матэвушах, Дукоры, Крычаве і г.д.

Паралельна з барока на Беларусі з’яўляецца класіцызм – стыль, які вызначаецца імкненнем да яснасці і чысціні прапорцый, ураўнаважанасці і гармоніі форм, увасабленнем значных грамадскіх, узвышаных, гераічных і маральных тэм, ідэалаў, спакою і строгасці. З сярэдзіны XVIII ст. класіцызм сцвярджаўся праз пасрэдніцтва магнатаў (Радзівілаў, Браніцкіх, Сапегаў) і іх культурныя сувязі з Францыяй. Архітэктуры класіцызму ўласцівыя строгія сіметрычна-восевыя кампазіцыі, архітэктурны ордэр, стрыманасць дэкаратыўнага афармлення. Уплыў класіцызму праявіўся пры будаўніцтве барочных палацава-паркавых ансамбляў (Альба, Ружаны, Гродна, Шчорсы, Свяцк і інш.). Архітэктары адмаўляліся ад празмернай складанасці і заблытанасці архітэктурных форм барока і ракако. Характэрнай часткай палацаў, сядзіб і некаторых культавых пабудоў стаў класічны ордэрны порцік (палац-рэзідэнцыя графа М. Румянцава і Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, палац і касцёл у Шчучыне, палацавы комплекс у Снове і інш.).

Пасля далучэння ўсходнебеларускіх зямель да Расіі з 1772 г. на развіццё беларускага мастацтва аказваў уплыў рускі класіцызм. Рускія архітэктары (М. Львоў, І. Староў) складалі і зацвярджалі планы гарадоў для Магілёўскай і Полацкай губерній, удзельнічалі у праектаванні будынкаў. Пры стварэнні тыпавых планаў праяўляўся прынцып рэгулярнасці з геаметрычнымі абрысамі, вылучэннем цэнтраў, плошчаў і галоўных вуліц.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобныя пабудовы стылю класіцызму ствараліся ў маёнтках арыстакратыі: палацы Гродзенскай сядзібы, Беніцкай сядзібы, Радзівілімонтаўскі палацава-паркавы ансамбль. У работах дойлідаў мясцовай архітэктурнай школы І. Зігфрыдана і І. Зэйдэля рысы класіцызму спалучаліся з рысамі барока. У пабудовах маёнткаў у Чачэрску і Магілёўскай сядзібы "Піпенберг" спалучаліся рысы класіцызму і псеўдаготыкі, характэрныя для псеўдагатычных пабудоў рускай архітэктурнай школы. У стварэнні палацава-сядзібных комплексаў існавала арыентацыя на віленскую і варшаўскую школу – у цэнтральных і заходніх раёнах Беларусі, ці на архітэктуру Пецярбурга і Масквы – ва ўсходніх.

З першай трэці XIX ст. пачынаецца новы этап мастацка-стылявой эвалюцыі – эклектыка. Для яе характэрны зварот да нацыянальнай свядомасці, новыя адносіны да гісторыі (у тым ліку праз зварот да архітэктурных форм мінулага). Рамантычны накірунак спрыяў звароту да мінулых мастацкіх стыляў у формаўтварэнні. Пабудовы страцілі вядучую ролю ордэра, іерархічнасць у чляненнях фасадаў. У грамадскіх будынках шырока выкарыстоўвалася раўнамерная рытмічная разбіўка плоскасцяў фасадаў, у дэталізацыі якіх пераважала сухасць і здробленасць форм, перанасычанасць дэкаратыўнымі элементамі. З 1830-х гг. у архітэктуры Беларусі ў рэчышчы эклектыкі развіваецца напрамак неаготыкі, які дасягнуў росквіту ў сярэдзіне XIX ст. (Косаўскі палац, Масалянскі палац) і звязаны з уплывам варшаўскай школы дойлідства. На Беларусі працавалі буйнейшыя варшаўскія архітэктары А. Ідзкоўскі, Ф. Яшчалд, Г. Маркові. У гэтыя часы ў архітэктуры назіралася супрацьстаянне двух стылявых напрамкаў: у прыватным будаўніцтве ў маёнтках мясцовых магнатаў развівалася неаготыка, а ў дзяржаўным будаўніцтве і працах рускіх архітэктараў – класіцызм.

З сярэдзіны XIX ст. новае мастацкае аблічча гарадоў пачынаюць фарміраваць будынкі масавага прызначэння: гарадское жыллё, даходныя дамы, навучальныя і адміністрацыйныя пабудовы і інш. Яны сталі сферай пашырэння эклектыкі. Асноўны ўхіл рабіўся на вонкавую дэкаратыўнасць фасадаў. Архітэктары адвольна спалучалі ў будынках формы готыкі, рэнесансу і барока, стваралі кангламерат архітэктурных форм, стыль якіх цяжка вызначыць. Напрыклад, навучальныя ўстановы і банкі звычайна афармляліся пад рэнесанс, касцёлы – пад готыку, тэатры – пад барока.

Як рэакцыя на эклектыку ў еўрапейскім мастацтве і архітэктуры канца XIX – пачатку XX ст. з'яўляецца стыль мадэрн. Ён вызначаецца абгрунтаванай планіроўкай, новымі прынцыпамі авангарднага формаўтварэння, асэнсаваннем новых канструкцый і матэрыялаў, шырокім выкарыстаннем хвалістых ліній у дэкоры і цякучых пластычных форм, крывалінейным малюнкам праёмаў, сінтэзам мастацтваў. Для мадэрна характэрна выкарыстанне (пры пэўнай стылізацыі) форм іншых эпох, аб'яднальнае значэнне арнаменту, падпарадкаванне асобных відаў і жанраў мастацтва адзінай мэце ансамбля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З 1890-х гг. многія архітэктары імкнуліся надаць сваім творам самабытны нацыянальны характар, пераасэнсоўвалі архітэктурную спадчыну беларускага сярэднявечча (напрыклад, у будынках чыгуначных вакзалаў у Брэсце, Полацку). Але нацыянальная самабытнасць выяўлялася пры гэтым не заўсёды адназначна. Традыцыйнае ўзаемадзеянне на Беларусі заходняй і ўсходняй культур выявілася ў дзейнасці як беларускіх (С. Шабунеўскі, М. Раманаў), так польскіх (С. Шылер, Ю. Дзянькоўскі, К. Казлоўскі) і рускіх (Р. Марфельд, К. Тон, К. Тарасаў, Ф. Шэхтэль) дойлідаў. Адметнай рысай ранняга беларускага мадэрну 1890 – 1907 гг. з'яўлялася дэманстратыўнае адмаўленне ад механічных копій гістарычных архітэктурных форм. На гэтым этапе асаблівая ўвага надавалася дэкаратыўна-пластычнаму афармленню фасадаў. Перыяд сталага мадэрну (1907 – 1917 гг.) характарызуецца трывалай сувяззю паміж архітэктурай і функцыяй будынка. Паслядоўнымі прадстаўнікамі стылізатарства на Беларусі сталі архітэктары, творчыя метады якіх былі заснаваны на рацыянальным спалучэнні функцыі і мастацка-эстэтычных якасцей будынка (як, напрыклад, будынак Гомельскай мужчынскай гімназіі, тэатральны будынак у Гродне). Мастацтва Беларусі ў рэчышчы мадэрна мела шматлікія праявы мастацка-стылявога развіцця. Найбольш пашыраным накірункам быў неакласіцызм (архітэктары Г. Гай і С. Гайдукевіч), рысы якога перавагаюць у забудове вуліц у Пінску, Мінску, Гродне і г.д. Уздзеянне эстэтыкі мадэрну выявілася таксама ў неараманскім і неагатычным накірунках культавых будынкаў у Мінску, Вілейцы, Івянцы, Міёрах, Ракаве і інш.

Горадабудаўнічыя і архітэктурна-мастацкія пераўтварэнні ў беларускім дойлідстве адбываліся ў агульным еўрапейскім кантэксце. У той жа час яны мелі характэрныя нацыянальныя і рэгіянальныя рысы, звязаныя з канкрэтнымі гістарычнымі і сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі, багатымі культурнымі і мастацкімі традыцыямі, творчым узаемадзеяннем з нацыянальнымі культурамі суседніх народаў. Такім чынам, для беларускага мастацтва канца XVI – пач. XX ст. характэрна існаванне такіх стыляў, як барока, ракако, класіцызм, мадэрн, а таксама стылістычных напрамкаў – рамантызм, неараманскі стыль, неаготыка, неабарока, неакласіцызм, неарускі стыль.

Глава 2 **“Сцэнічная прастора і тэатральныя збудаванні Беларусі ў кантэксце развіцця асноўных стыляў канца XVI – пачатку XX стагоддзя”** складаецца з трох раздзелаў і прысвечана даследаванню сцэнічнай прасторы і тэатральнай архітэктуры Беларусі ў залежнасці ад мастацка-стылявой эвалюцыі.

Раздзел 2.1 **“Увасабленне стылявых асаблівасцяў барока і ракако ў сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаваннях канца XVI – XVIII стагоддзя”** раскрывае характар фарміравання і развіцця стыляў барока і ракако ў архітэктуры і тэатральным мастацтве Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сцэнічная прастора і тэатральныя збудаванні канца XVI – XVIII ст. знаходзіліся пад непасрэдным уплывам стылю барока, а з XVIII ст. – ракако. Стыль барока знайшоў сваё адлюстраванне ў афармленні сцэнічнай прасторы для паратэатральных дзей – тэатралізаваных урачыстых богаслужэннях, пахавальных працэсіях і свецкіх увесяленнях (балах, урачыстых шэсцях, уездах у гарады і ўладанні, конных "каруселях", тэатралізаваных паляваннях і інш.). У адпаведнасці са стылістыкай барока сцэнічная прастора набывала пышнасць, пампезнасць, дэкаратыўнасць. Для стварэння мастацкага вобразу выкарыстоўваліся надзвычай яркія і сакавітыя колеры. Адным з асноўных прынцыпаў барока з'яўляецца сінтэтычнасць. Гэты прынцып у поўнай меры знайшоў сваё ўвасабленне ў сцэнічнай прасторы школьнага тэатра. Спектаклі школьнага тэатра ўяўлялі сабой пышнае пампезнае відовішча з музыкай, спевамі, танцамі. У прадстаўленнях пастаноўшчыкі ўмела выкарыстоўвалі гук і колер, кантрастныя, вычварныя, часам дысгарманічныя іх спалучэнні. Дынаміка барока патрабавала імгненнай змены дзеяння, візуальных і акустычных эфектаў. Для гэтага дэкарацыйнае афармленне школьнай сцэны ўключала жывапісныя, жывапісна-аб'ёмныя і аб'ёмна-перспектыўныя дэкарацыі, што спрыяла стварэнню святочнай атмасферы спектакля. Грунтуючыся на трактатах М.К. Сарбеўскага, Ф. Ланга, багатае афармленне стваралі мастакі-дэкаратары Я. Т. Клаўс, А. Дэ ла Марс, Г. Грубер і інш. Для раскрыцця мастацкага вобразу пастаноўкі асаблівая ўвага надавалася касцюму, які насіў дыферэнцаваны характар: канкрэтны бытавы касцюм ужываўся для камедый і балетаў, умоўна-абагулены – для трагічных герояў, бостваў і персанажаў алегарычнага і сімвалічнага характару.

Школьныя тэатры існавалі ў Полацку, Гродне, Пінску, Віцебску, Брэсце, Мінску, Слоніме і г.д. Спачатку паказ спектакляў адбываўся ў будынках кляштараў, калегій, школ, дзе былі спецыяльныя тэатральныя залы са сталай сцэнай, абсталяванай спецыяльнымі механізмамі. Яны ўяўлялі сабой прыстасаваныя для паказаў рэкрэацыйныя залы навучальных устаноў. Часта сцэнічная прастора выходзіла за межы памяшканняў – на вуліцы, плошчы – і патрабавала адпаведнага афармлення. З сярэдзіны XVIII ст. для пастаноўкі школьных спектакляў пачалі выкарыстоўваць пастаянныя памяшканні магнацкіх тэатраў (Нясвіж, Слуцк). Па сутнасці, школьныя тэатры асвойвалі два тыпы сцэнічнай прасторы – адкрытую плошчу і замкнёную чатырма сценамі класічную сцэну-каробку, дзе будаваўся сцэнічны памост з высока ўзнятым планшэтам і сістэмай тэларыйных дэкарацый, а пазней рухомых куліс.

Самастойныя тэатральныя збудаванні пачалі з'яўляцца на беларускіх землях з фарміраваннем магнацкіх прыватнаўласніцкіх тэатраў у Нясвіжы, Слуцку, Слоніме, Гродне і г. д. Іх архітэктурнае аблічча адказвала асноўным прынцыпам стыляў барока і ракако: вытанчанасць, крывалінейныя паверхні, выгнутыя плоскасці, скульптурныя кампазіцыі, пластычная арнаментыка, камернасць. Такім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было і першае стацыянарнае тэатральнае памяшканне, пабудаванае ў Нясвіжы архітэктарам К. Ждановічам. Майстэрства тэатральнага архітэктара праяўлялася ў стварэнні ўтульнай залы, добрай акустыкі, упрыгожванні ложаў, тэхнічным абсталяванні сцэны.

Стылі барока і ракако знайшлі сваё ўвасабленне ў сцэнічнай прасторы магнацкага прыватнаўласніцкага тэатра Ф. У. Радзівіл. Нясвіжская сцэнаграфія выкарыстоўвала передавыя кампазіцыйныя прыёмы афармлення спектакля: барочная ўрачыстасць, дэкаратыўнасць, манументальнасць, індывідуалізацыя, маляўнічасць, пастаральнасць. Магчымасці машынерыі, асвятлення, тэхнічнае абсталяванне сцэны было на высокім для таго часу ўзроўні. У нясвіжскім тэатры выкарыстоўваліся передавыя шматлікія варыянты афармлення сцэны, якія сведчаць аб шыраце ўспрынятай у Нясвіжы еўрапейскай традыцыі – кулісныя і некулісныя, сіметрычныя і асіметрычныя пабудовы, адкрытая і закрытая прасторы. Пацверджаннем гэтаму служаць гравюры М. Жукоўскага. Традыцыя ўзвядзення тэатральных пабудоў і іх афармлення была працягнута ў спецыяльных тэатральных будынках, якія з’явіліся ў Слуцку, Гродне і Слоніме.

Раздзел 2.2 **“Стылістыка класіцызму ў архітэктуры і тэатральным мастацтве другой паловы XVIII – першай паловы XIX стагоддзя”** прысвечаны аналізу ўвасаблення класіцыстычных рысаў у афармленні сцэнічнай прасторы і тэатральных будынкаў на тэрыторыі нашай краіны. Класіцызм пачынае распаўсюджвацца ў архітэктуры Беларусі разам з барока і ракако ў апошняй трэці XVIII ст.

Нарматыўная эстэтыка класіцызму патрабуе ад сцэнічнай прасторы фармальнага адзінства часу, месца і дзеяння; падкрэсліванне ў характарыстыцы героя адной дамінуючай рысы; перавагі маналогаў над дзеяннем. Шырокае распаўсюджанне класіцызму ў драматургіі аказала значны ўплыў на манеру акцёрскай гульні і характар сцэнічнай прасторы. Разам са свецкай вытанчанасцю тэатральная эстэтыка патрабавала гераізацыі і манументальнасці вобраза. Найбольш запатрабаванай эстэтыка класіцызма была ў школьным тэатры, дзе адпаведна канону сфарміраваліся тэатральныя амплуа, выразная дэкламацыя, асаблівая пастаноўка голасу, адсутнасць прастамоўных інтанацый, характэрная сцэнічная пластыка і рухі, дакладнае мізансцэніраванне. Сцэнічная прастора класіцыстычнага спектакля будавалася строга сіметрычна, акцёры размяшчаліся тварам да гледача ў адзін рад з галоўным героем у цэнтры. Дэкарацыі з’яўляліся маляўнічым фонам. Прыкладам тыповай класіцысцкай цэнтрычнай дэкарацыі можа служыць кулісная перспектыўная дэкарацыя тэатра ў Дзярэчыне, створаная І. С. Бекерам, адзіная вядомая ў Беларусі з апошняй чвэрці XVIII ст. На першым плане з абодвух бакоў сцэны стаяць пілоны, увенчаныя статуямі, а за пілонамі – рады баскетаў, якія сыходзяцца ў цэнтры ратонды, завершанай купалам са скульптурай.

Тэатральныя збудаванні другой паловы XVIII – першай паловы XIX ст. знаходзіліся пад уздзеяннем як барока, так і класіцызму. Архітэктурныя пабудовы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

злучалі тэатральную фантазійнасць барока з нарматыўнай строгасцю класіцызму. У стылі ранняга класіцызму вызначалася пабудова тэатральнага флігеля ў Ружанскім палацы. Спецыяльна пабудаваныя тэатральныя збудаванні ці бальныя залы, прыстасаваныя для тэатральных паказаў, былі ў Дзярэчыне, Шклове, Свіслачы, Плешчаніцах. Значна ўзрасла інтэнсіўнасць тэатральнага жыцця. Амаль кожны шляхціч імкнуўся стварыць свой тэатр. Для праектавання і будаўніцтва тэатраў запрашаліся як замежныя архітэктары, так і мясцовыя майстры: І. С. Бекер у Ружаны, І. Мараіна ў Слонім і інш. За аснову большай колькасці будынкаў бралася форма масіўнага прамавугольніка, і па характару архітэктуры тэатры прынцыпова не адрозніваліся ад тых, што будаваліся ў Заходняй Еўропе і Расіі.

У раздзеле 2.3 **“Сцэнічная прастора і тэатральныя збудаванні другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя: мастацка-стылявая эклектыка”** прааналізаваны асноўныя стылявыя плыні і накірункі другой паловы XIX – пачатку XX ст., якія ўплывалі на фарміраванне сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў.

Названы перыяд на тэрыторыі Беларусі характарызуецца мастацка-стылявой эклектыкай. Дойліды звярталіся да мастацтва мінулых эпох, што характэрна для еўрапейскай архітэктуры акрэсленага перыяду. Буйныя гарадскія тэатры праектуюцца як асобныя рэпрэзентатыўныя будынкі і набываюць значнасць у гарадской забудове. У адным рэчышчы з будаўніцтвам рангавых тэатраў у Дрэздэне, Стакгольме, Кракаве, Львове і інш. з’яўляецца будынак гарадскога тэатра ў Мінску. На Беларусі эклектыка ў тэатральных збудаваннях праявілася таксама ў выкарыстанні старажытнарускай і візантыйскай архітэктурнай спадчыны (тэатры ў Магілёве, Гродне). Усе названыя тэатры мелі плоскі партэр, ярусы ложаў і глыбокую сцэну. Да пачатку XX ст. з’яўляюцца новыя формы тэатральных збудаванняў: тэатр-вар’етэ (Мінск), тэатр-цырк (Брэст), кінатэатр (Гродна). Усе яны імкнуліся перадаць спецыфіку стылю мадэрн праз стылізацыю форм мінулага, сімвалічнасць, арнаментацыю і дэкараванасць.

Стылявая эклектыка парадзіла разнастайнасць у афармленні сцэнічнай прасторы. Увасабленне на сцэне набыў прынцып гістарызму з яго рамантычнай накіраванасцю і адлюстраваннем гістарычных архітэктурных помнікаў і прыродных ландшафтаў (скалы, масты, лесвіцы і г.д.), касцюмаў, прадметаў побыту. Паступова сцвярджаюцца рэалістычныя тэндэнцыі з этнаграфічным характарам і паказам нацыянальнага каларыту ў касцюмах, роспісах, рэквізіце (тэатры І. Буйніцкага і У. Галубка). Але ж у большасці тэатраў у драматычных спектаклях на сучасныя тэмы, як правіла, выкарыстоўваліся “дзяжурныя” шаблонныя тыпавыя павільёны, дэкарацыі і касцюмы.

Такім чынам, на пачатку XX стагоддзя сцэнічная прастора і тэатральная архітэктура эвалюцыянавалі ў адпаведнасці з дамінуючымі мастацкімі стылямі, плынямі і накірункамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

У выніку праведзенага даследавання былі сфармуляваны наступныя вывады:

1. У сучасным мастацтвазнаўстве прадстаўлены розныя трактоўкі паняццяў “сцэнічная прастора” і “тэатральныя збудаванні”. Сцэнічная прастора з’яўляецца месцам стварэння і ўвасаблення мастацкага вобраза спектакля і заснавана на сінтэзе рэальнай трохмернай і ірэальнай ілюзорнай прасторы. Рэальная сцэнічная прастора вызначаецца тэхнічнай насычанасцю сцэны, яе памерамі, характарам архітэктурнай узаемазвязанасці сцэны і глядзельнай залы, што вызначае яе асаблівасці (сцэна-арэна, сцэна-каробка, прасторавая, кальцавая і сімультанная сцэна і г. д.). Рэальная сцэнічная прастора можа аддзяляцца кулісамі і падугамі, памяншацца ўглыб пры дапамозе заслон і задніка. У сцэнічнае дзеянне ўваходзяць усе віды прасторава-пластычных мастацтваў: мастацтва архітэктуры (у будове і планіроўцы дэкарацый), скульптуры (у дэкарацыях і бутафорыі), дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (у бутафорыі і рэквізіце). Ірэальная сцэнічная прастора спектакля мяняецца з улікам узаемаадносін мас, светлавога стану, колеравых сувязяў, графікі і г.д. Грунтуючыся на сінтэтычнай прыродзе сцэнічнай прасторы, мы вылучаем прастору, якая канкрэтна ўспрымаецца публікай на сцэне і складаецца з дэкарацый, асвятлення, машынерыіі, касцюма, грыма, музыкі, акцёрскай мовы і пластыкі. На фарміраванне сцэнічнай прасторы непасрэдны ўплыў аказвае мастацка-стылявая эвалюцыя эпохі. У залежнасці ад пануючага мастацкага стылю ці напрамку ў Беларусі вылучаюцца наступныя тыпы сцэнічнай прасторы: барочная прастора школьнага тэатра, ракайльная прастора прыватнаўласніцкага тэатра, прастора класічнай трагедыі, рамантычная, натуралістычная, сімвалісцкая прасторы.

Тэатральнае збудаванне – гэта архітэктурная пабудова, прызначаная для правядзення тэатралізаваных дзей і прадстаўленняў, якая складаецца з прасторы сцэны і глядзельнай залы і садзейнічае прасторанаму вырашэнню сцэнічнага твора. Тэатральныя збудаванні вызначаюцца па відах (адкрытыя і закрытыя), і тыпах (амфітэатр, “іспанскі” дваровы, “італьянскі” і “французскі” ярусныя тэатры, “нямецкі” сектаральны). Па прынцыпах пабудовы тэатры могуць быць як спецыяльна пабудаванымі, калі пры будаўніцтве ў іх прадугледжваліся памяшканні для тэатра (сцэна, глядзельная зала, фае, грымёрныя, дэкарацыйныя майстэрні), так і прыстасаванымі, калі такія памяшканні не вызначаліся (актавыя залы калегіумаў і школ, бальныя залы ў замках, палацах і сядзібах, рэкрэацыйныя залы народных дамоў і пажарных дэпо і г.д.). Іх канструкцыйныя і дэкаратыўныя асаблівасці залежалі ад пануючага мастацкага стылю. Асноўныя тыпы тэатральных збудаванняў сфарміравалася да пачатку XX ст. Далейшыя вынаходніцтвы былі звязаны з развіццём сцэнаграфіі. Эвалюцыя тэатральных збудаванняў адлюстроўвае выкананне асноўнай функцыі – падрыхтоўку і правядзенне тэатральных паказаў перад публікай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэатральныя збудаванні размяшчаюцца ў гарадскіх грамадскіх цэнтрах, на плошчах, або гарадскіх магістралях і актыўна фарміруюць іх архітэктурнае аблічча. Тэатральны будынак часцей за ўсё носіць рэпрэзентатыўны характар, ён з'яўляецца стылестваральным элементам гарадскога асяроддзя, яго лагічным і эстэтычным цэнтрам.

Развіццё сцэнічнай прасторы і тэатральнай архітэктуры ў беларускім мастацтве цесна звязана з асноўнымі змястоўна-стылістычнымі тэндэнцыямі: барока і ракако (канец XVI – XVIII ст.), класіцызму (другая палова XVIII – першая палова XIX ст.), эклектыкі і мадэрну (другая палова XIX – пачатак XX ст.). Творы тэатральнай архітэктуры і мастацтва існавалі як неад'емная частка агульнаеўрапейскай мастацкай культуры, але мелі разам з тым спецыфічныя нацыянальныя рэгіянальныя рысы [3; 5; 6; 9; 18; 20].

2. З канца XVI па XVIII ст. на беларускіх землях пануе барока – мастацкі стыль, у якім праявіўся сінтэз мастацтваў і які храналагічна супадае з заходнеўрапейскім стылем, але мае сваю нацыянальную спецыфіку. Фарміраванню сцэнічнай прасторы эпохі спрые дзейнасць батлейкі і школьнага тэатра. Тэатралізацыя як адзін з асноватворных прынцыпаў стылю спрыяла фарміраванню сцэнічнай культуры і выхаду сцэнічнай прасторы ў паратэатральных дзеях (богаслужэбных працэсіях і свецкіх увесяленнях) за межы тэатральнай залы (збудавання) на адкрытыя пляцоўкі. Асноўныя прыёмы сцэнаграфіі выпрацоўваюцца ў школьных тэатрах езуіцкіх калегіумаў у Полацку, Гродне, Віцебску, Пінску, Мінску і інш. і атрымліваюць далейшае развіццё на прыватнаўласніцкай тэатральнай сцэне Нясвіжа, Слуцка, Слоніма, Гродна і г.д. У адпаведнасці з мастацтвам барока, у рэчышчы якога развіваўся школьны тэатр, спектакль уяўляў сабой пышнае відовішча з музыкай, спевамі, танцамі. Пастаноўшчыкі імкнуліся да імгненнай змены дэкарацый (з дапамогай тэларый і куліс), да зачаравання гледача візуальнымі і акустычнымі эфектамі, да ўдасканалення тэатральных прыстасаванняў. Афармленне беларускіх школьных тэатраў названага перыяду грунтавалася на трактатах М. К. Сарбеўскага, Ф. Ланга, Я. Масэны і з'яўлялася адбіткам мастацкай практыкі заходнееўрапейскага тэатра.

Для тэатральных збудаванняў характэрны дынамізм, пышнасць, дэкаратыўнасць, выкарыстанне ракайльнага арнаменту. Першае стацыянарнае збудаванне з'явілася ў Нясвіжы (арх. К. Ждановіч), але яно не абмяжоўвала пастаноўку тэатральных дзей закрытай сцэнай. Пра гэта сведчаць гравюры М. Жукоўскага, дзе адлюстраваны сцэны са спектакляў, якія адбываліся на адкрытых пляцоўках на фоне архітэктурных пабудоў Нясвіжа. У XVIII ст. у пастаноўках прыватнаўласніцкіх тэатраў праяўляліся барока і строгі класіцызм, а таксама элементы стылю ракако – прыватнасць, камернасць, вытанчанасць, мудрагелістасць. Падобныя тэатральныя прадстаўленні ў межах барочных і ракайльных традыцый адбываліся ў тэатрах Г. Радзівіла ў Слуцку, А. Тызенгаўза ў Гродне (архітэктар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дж. Сака), Швыкоўскіх у Пружанах, Я. Храптовіча ў Бешанковічах. Менавіта магнацкія тэатры сталі вяршыняй развіцця тэатральнага мастацтва ў XVIII стагоддзі, яны выкарыстоўвалі ўсе магчымасці тэхнікі і афармлення, вядомыя на той час [2; 7; 8; 11 –14; 17; 19; 25].

3. Эпоха Класіцызму прыўнесла ў тэатральнае мастацтва эстэтыку рацыяналізму. На вонкавым выглядзе збудаванняў, на сцэнічнай пляцоўцы, на тэатральным касцюме, на паводзінах акцёраў на сцэне адбілася стылістыка класіцызму: яснасць, дакладнасць, строгасць, простыя лініі, выкарыстанне архітэктурнага ордэра, дэкаратыўных калон, імкненне пераймаць ідэалы старажытнасці. Асаблівасці класіцызму на тэрыторыі Беларусі тлумачацца тым, што ён не прышоў на змену барока, а існаваў побач з ім, таму тэатральнае мастацтва канца XVIII – першай паловы XIX ст. у збудаваннях і афармленні спалучае матывы барока і строгага класіцызму: архітэктура тэатраў ствараецца па класіцыстычных канонах, а дэкарацыі, касцюмы і складаная тэхніка адпавядаюць стылістыцы барочных прадстаўленняў. Такімі былі тэатры М. К. Агінскага ў Слоніме (архітэктар І. Мараіна), А. Сапегі ў Ружанах (архітэктар І. С. Бекер). Станаўленне класіцызму ў мастацтве Беларусі супадае з далучэннем да Расійскай імперыі, а таму характарызуецца суседствам розных мастацкіх школ. У стварэнні палацава-сядзібных комплексаў уладальнікі маёнткаў, буйныя памешчыкі, арыентаваліся на варшаўскую ці мясцовую віленскую школу – у цэнтральных і заходніх раёнах Беларусі, або на архітэктуру Пецярбурга і Масквы – ва ўсходніх. У стылі класіцызму будуюцца сядзібы і маёнткі, у якіх адбываліся тэатральныя паказы: С. Зорыча ў Шклове, Тышкевічаў у Свіслачы і Плешчаніцах і г.д. [1; 15; 16; 23].

4. Складаным перыядам эвалюцыі тэатральных збудаванняў і сцэнічнай прасторы стала другая палова XIX – пачатак XX ст. Для яго характэрны разнастайныя варыянты існавання стыляў, накірункаў і плыняў: мадэрн, неарускі, неавізантыйскі стыль і эклектыка. У гэты перыяд змяніліся адносіны грамадства да тэатральнага мастацтва, якое набывае ўсё большую распаўсюджанасць, актыўнасць гастраліруючых труп павялічваецца, і для тэатральных відовішчаў прыстасоўваюць залы гарадскіх памяшканняў (бальныя і актавыя залы дзяржаўных устаноў, народныя дамы), а таксама ўзводзяць спецыяльныя будынкі публічнага выкарыстання: драўляныя летнія тэатры, кіна- і электратэатры, цыркі. У той жа час з’яўляюцца тыпавыя праекты тэатральных будынкаў, якія становяцца цэнтрам гарадскога жыцця, дамінантай горада: гарадскія стацыянарныя тэатры ў Мінску (неарэнесанс, архітэктар К. Казлоўскі), Магілёве (неарускі, архітэктар П. Камбураў), Гродне (“цагляны” рэтраспектыўна-рускі стыль, архітэктар М. Раманаў) і г.д. Усе названыя тэатры былі яруснага тыпу з глыбокай сцэнай. Праявы стылю мадэрн знайшлі сваё адлюстраванне ў праектах тэатраў-вар’етэ (Мінск), тэатраў-цыркаў (Брэст), электра- і кінатэатраў (у Гродне, в. Крынкі Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці і інш.). Спецыфіка мадэрна перадавалася праз стылізацыю форм мінулага, сімвалічнасць, арнаментацыю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і дэкарыраванасць вонкавага выгляду збудавання, яго архітэктурнага і дэкаратыўнага вырашэння.

У афармленні сцэнічнай прасторы адной з асноўных рысаў стала звяртанне да прынцыпу гістарызму, а таксама праяўленне рэалістычных тэндэнцый. Рамантычныя карціны месцаў дзеяння паказваліся на жывапісных задніках, на фоне якіх будавалася дэкарацыя з асіметрычна размешчаных аб'ёмных прадметаў: элементаў архітэктуры, натуральнай мэблі і бутафорскіх формаў прыроднага ландшафту; аб'ёмныя дэталі афармлення адлюстроўвалі скалы, масты, лесвіцы, калоны і г.д. Тэатральныя мастакі валодалі вузкай спецыялізацыяй і падзяляліся на "пейзажных", "архітэктурных", "касцюмных" і г.д. У драматычных спектаклях на сучасныя тэмы выкарыстоўваліся зборныя ці дзяжурныя тыпавыя дэкарацыі: "бедны" і "багаты" пакой, "лес", "сельскі краявід" і г.д. Рэалістычныя і натуралістычныя тэндэнцыі афармлення сцэнічнай прасторы знайшлі працяг у дзейнасці беларускіх труп І. Буйніцкага і У. Галубка і паўплывалі на станаўленне тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва першай чвэрці ХХ ст. Яркім праяўленнем такога напрамку стала афармленне спектакляў першымі прафесійнымі мастакамі-дэкаратарамі дзяржаўных тэатраў (А. Марыкс, К. Елісееў, Н. Ціханаў) [4; 10; 21; 22; 24].

***Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў***

Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання атрымалі ўкараненне аўтарам у вучэбныя дысцыпліны "Гісторыя мастацтваў: тэатральнае", "Гісторыя мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства", "Гісторыя мастацтваў: выяўленчае мастацтва" ва ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", пра што сведчаць тры акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 22.04.2017, 11.06.2018, 08.01.2019.

Палажэнні і вывады прадстаўленага даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы вучэбных праграм і вучэбна-метадычных дапаможнікаў па мастацтвазнаўстве, тэорыі і практыцы тэатральнага і выяўленчага мастацтва, архітэктуры ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Навуковыя палажэнні і вывады дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца ў практычнай дзейнасці архітэктараў, сцэнографаў і рэжысёраў-пастаноўшчыкаў пры стварэнні тэатральных збудаванняў і сцэнічнай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах

1. Няборская, А. В. Сцэнаграфія і рэпертуар Слонімскага тэатра Міхала Казіміра Агінскага / А. В. Няборская // Музычнае і тэатральнае мастацтва: праблемы выкладання. – 2004. – № 1 (7). – С. 20 – 22.

2. Няборская, А. В. Сцэнаграфія школьнага езуіцкага тэатра ў Беларусі XVII – XVIII стст. / А. В. Няборская // Музычнае і тэатральнае мастацтва: праблемы выкладання. – 2004. – № 2 (8). – С. 28 – 30.

3. Няборская, А. В. Тэатральная культура Беларусі эпохі Асветніцтва ў агульнаеўрапейскім кантэксце / А. В. Няборская // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2004. – № 3. – С. 46 – 50.

4. Пагоцкая, А.В. Стылявыя асаблівасці тэатральнай архітэктуры Беларусі XIX – пачатку XX ст. / А. В. Пагоцкая // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі: зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2008. – Вып. 5. – С. 104 – 109.

5. Пагоцкая, А. В. Сцэнаграфія як прадмет навуковага даследавання / А. В. Пагоцкая // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2009. – № 1 (11). – С. 61 – 67.

6. Пагоцкая, А. В. Уплыў мастацка-стылявой эвалюцыі на фарміраванне сцэнічнай прасторы і тэатральнай архітэктуры Беларусі / А. В. Пагоцкая // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2018. – № 1 (29). – С. 115 – 122.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

7. Няборская, А. В. Мастацкія традыцыі школьнага тэатра ў Беларусі / А. В. Няборская // Панарама мастацтва ў дыяпазоне сучасных даследаванняў: зб. навук. арт. / рэдкал.: В. П. Пракапцова (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 77 – 79.

8. Няборская, А. В. Тэатральная гісторыя Слуцка ў XVII – пач. XX ст. / А. В. Няборская // Чалавек і культура: праблемы гармоніі : зб. навук. арт. аспірантаў ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 126 – 130.

9. Пагоцкая, А. В. Эвалюцыя тэатральнага збудавання: ярусны тэатр / А. В. Пагоцкая // Культура. Наука. Творчество : VIII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 15 мая 2014 г. : сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: В. М. Черник (пред.) [и др.]. – Минск, 2014. – С. 152 – 158.

10. Пагоцкая, А. В. Тэатральныя збудаванні Мінска XVIII – XIX стст. / А. В. Пагоцкая // Культура: открытый формат – 2015 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; [сост.: Т. Н. Бабич, А. И. Гурченко, Ю. А. Переверзева] ; ред. сов.: В. Р. Языкович (пред.) [и др.]. – Минск, 2015. – С. 168 – 171.

11. Пагоцкая, А. В. Сцэнаграфія народнага тэатра / А. В. Пагоцкая // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф., Мінск, 24–26 крас. 2015 г. / Беларус. дзярж. ун-т

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры і мастацтваў ; рэдкал. : В.Р. Языковіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2015. – С. 75 – 77.

12. Пагоцкая, А. В. Дэкарацыйнае афармленне батлеечнага тэатра / А. В. Пагоцкая // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: Языковіч В. Р. (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 127 – 129.

13. Пагоцкая, А. В. Традыцыі афармлення народнай драмы ў Беларусі / А. В. Пагоцкая // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі) : зб. навук. прац / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: Языковіч В. Р. (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 98 – 99.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

14. Няборская, А. В. “Паэтыка” Мацея Казіміра Сарбеўскага і яе роля ў развіцці тэатра і асобы мастака / А. В. Няборская // Сацыяльна-гуманітарныя навукі ў сістэме вышэйшай школы : матэрыялы навук.-метад. канф., Мінск, 5–6 лютага 2002 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры ; рэдкал.: А.І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2003. – С. 157 – 161.

15. Няборская, А. В. Заходнееўрапейскія стылі: культурны ўплыў на развіццё беларускага мастацтва ў XVII – пач. XIX стст. / А. В. Няборская // Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі : матэрыялы навук. канф., ч. II, Мінск, 25–26 сак. 2003 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры ; рэдкал. М. А. Бяспалая, І. Л. Коган, А. І. Смолік. – Мінск, 2003. – С. 274 – 281.

16. Пагоцкая, А. В. Тэатральная архітэктура 2-й паловы XVIII – пачатку XIX ст. на тэрыторыі Беларусі / А. В. Пагоцкая // XI Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў, Мінск, 24–26 мая 2005 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2006. – С. 102 – 106.

17. Пагоцкая, А. В. Нясвіжскі тэатр Уршулі Радзівіл / А. В. Пагоцкая // Таленавітыя жанчыны Беларусі ў культурнай, навуковай і мастацкай прасторы свету : зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-практ. канф., Мазыр, 24–25 мая 2007 г. / УА МДПУ імя І. П. Шамякіна ; адк. рэд. А. У. Сузько. – Мазыр, 2007. – С. 65 – 69.

18. Пагоцкая, А. В. Кампаратывізм у сучасным тэатразнаўстве (да пытання даследавання тэатральных збудаванняў і сцэнаграфіі Беларусі XVI – пач. XX ст.) / А. В. Пагоцкая // Культура. Наука. Творчество : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 19–20 апр. 2007 г. / Белорус. гос. акад. искусств. – Минск, 2008. – С. 177 – 178.

19. Пагоцкая, А. В. Школьныя тэатры на Беларусі (канец XVI – XVIII стст.) / А. В. Пагоцкая // XV Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, матэрыялы чытанняў, Мінск, 21–24 мая 2009 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 118 – 122.

20. Пагоцкая, А. В. Даследаванне архітэктуры і сцэнаграфіі беларускага тэатра: кампаратыўны падыход / А. В. Пагоцкая // Культура. Наука. Творчество : материалы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

IV Междунар. науч.-прак. конф., Минск, 20–23 апр. 2010 г. / Белорус. гос. акад. искусств. – Минск, 2011. – С. 322 – 325.

21. Пагоцкая, А. В. Тэатральная архітэктура Беларусі XIX ст. у кантэксце развіцця еўрапейскіх стыляў / А. В. Пагоцкая // Духоўныя асновы сучаснай культуры: праблемы захавання культурнай спадчыны : матэрыялы XVI Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў, Мінск, 26–28 мая 2010 г. : у 2 т. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 72 – 75.

22. Пагоцкая, А. В. Сцэнаграфія Беларусі: ад вытокаў да пачатку XX ст. / А. В. Пагоцкая // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навук. канф., прысвечанай 35-годдзю БДУКМ, Мінск, 3 снеж. 2010 г. : у 2 т. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 29 – 36.

23. Пагоцкая, А. В. Этапы станаўлення беларускай сцэнаграфіі: ад вытокаў да пачатку XX ст. / А. В. Пагоцкая // Актуальныя праблемы мастацтва: гісторыя, тэорыя, методыка : матэрыялы II Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 7–8 крас. 2011 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. І. Жук, М. Р. Баразна, У. А. Васілевіч [і інш.] ; адк. рэд. Ю. Ю. Захарына. – Мінск, 2011. – С. 69 – 71.

24. Пагоцкая, А. В. Асаблівасці тэатральнай архітэктуры Беларусі XIX – пачатку XX ст. / А. В. Пагоцкая // Матэрыялы XIX Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 22–24 мая 2013 г. : у 2 ч. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – Ч. 1. – С. 101 – 105.

25. Пагоцкая, Е. В. Синтез искусств в театре А. Тизенгауза / Е. В. Пагоцкая // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва: інавацыйныя падыходы : матэрыялы навук. канф. праф.-выкладчыцкага складу, прысвеч. 40-годдзю заснавання БДУКМ, Мінск, 25 лістап. 2015 г. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: Ю. П. Бондар (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 307 – 311.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЭ

## ПАГОЦКАЯ АЛЕНА ВІКТАРАЎНА

## МАСТАЦКА-СТЫЛЯВАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ СЦЭНІЧНАЙ ПРАСТОРЫ І ТЭАТРАЛЬНЫХ ЗБУДАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ КАНЦА XVI – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

**Ключавыя словы:** мастацка-стылявая эвалюцыя, мастацкі стыль, плыня, напрамак, сцэнічная прастора, тэатральная архітэктура, тэатральныя збудаванні, архітэктура, тэатр.

**Мэта даследавання:** выявіць мастацка-стылявыя асаблівасці эвалюцыі сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў у Беларусі канца XVI – пачатку XX стагоддзя.

**Метады даследавання:** дысертацыйная работа грунтуецца на комплексным падыходзе, які заснаваны на прынцыпах усебаковасці, гістарызму і аб’ектыўнасці, што дазволіла разглядаць сцэнічную прастору і тэатральныя збудаванні як цэласны комплекс узаемазвязаных кампанентаў у рэчышчы мастацка-стылявой эвалюцыі. Таксама былі выкарыстаны метады мастацтвазнаўчага аналізу, гісторыка-культурны, кампаратыўны.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Дысертацыя з’яўляецца першым у беларускім мастацтвазнаўстве комплексным даследаваннем сцэнічнай прасторы і тэатральных збудаванняў у кантэксце мастацка-стылявой эвалюцыі. У рабоце ўпершыню дана характарыстыка ўвасаблення прынцыпаў стыляў барока і ракако ў сцэнічнай прасторы і тэатральных пабудовах Беларусі, раскрыта мастацкая спецыфіка класіцызму ў тэатральнай архітэктуры і дэкарацыйным мастацтве. Абгрунтавана паняцце стылявой эклектыкі ў тэатральным мастацтве і архітэктуры канца XIX – пачатку XX ст. Уведзены ў навуковы ўжытак новы паняційны апарат, абагульнены вялікі факталагічны матэрыял.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны ў далейшай навукова-даследчай дзейнасці пры падрыхтоўцы спецыяльных навуковых выданняў, манаграфій, у адукацыйным працэсе пры распрацоўцы вучэбных курсаў у сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах мастацкага профілю, а таксама ў практычнай дзейнасці пры арганізацыі сцэнічнай прасторы і стварэнні праектаў тэатральных збудаванняў.

**Галіна выкарыстання:** мастацтвазнаўства, гісторыя беларускай і сусветнай мастацкай культуры, мастацкая адукацыя, гісторыя архітэктуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

## ПАГОЦКАЯ ЕЛЕНА ВИКТОРОВНА

## ХУДОЖЕСТВЕННО-СТИЛЕВАЯ ЭВОЛЮЦИЯ СЦЕНИЧЕСКОГО ПРОСТРАНСТВА И ТЕАТРАЛЬНЫХ СООРУЖЕНИЙ В БЕЛАРУСИ КОНЦА XVI – НАЧАЛА XX ВЕКОВ


**Ключевые слова:** художественно-стилевая эволюция, художественный стиль, течение, направление, сценическое пространство, театральная архитектура, театральные сооружения, архитектура, театр.

**Цель работы:** определить художественно-стилевые особенности эволюции сценического пространства и театральных сооружений в Беларуси конца XVI – начала XX века.

**Методы исследования:** диссертационная работа базируется на комплексном подходе, который основан на принципах всесторонности, историзма и объективности, что позволило рассматривать сценическое пространство и театральные сооружения как целостный комплекс взаимосвязанных компонентов в русле художественно-стилевой эволюции. Также были использованы методы искусствоведческого анализа, историко-культурный, компаративный.

**Полученные результаты и их новизна.** Диссертация является первым в белорусском искусствоведении комплексным исследованием сценичного пространства и театральных сооружений в контексте художественно-стилевой эволюции. В работе впервые дана характеристика воплощения принципов стилей барокко и рококо в сценическом пространстве и театральных зданиях и сооружениях Беларуси, раскрыта художественная специфика классицизма в театральной архитектуре и декорационном искусстве. Обосновано понятие стилевой эклектики в театральном искусстве и архитектуре конца XIX – начала XX в. Введен в научный обиход новый понятийный аппарат, обобщен обширный фактологический материал.

**Рекомендации по использованию.** Результаты диссертационного исследования могут быть использованы в дальнейшей научно-исследовательской деятельности при подготовке специальных научных изданий, монографий, в образовательном процессе при разработке учебных курсов в средних специальных и высших учебных заведениях художественного профиля, а также в практической деятельности при организации сценического пространства и создании проектов театральных сооружений.

**Область применения**: искусствоведение, история белорусской и мировой художественной культуры, художественное образование, история архитектуры.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**SUMMARY**

**PAHOTSKAYA ELENA**

**ART-STYLE EVOLUTION OF THE STAGE SPACE AND THEATRICAL FACILITIES IN BELARUS AT THE END OF 16TH – EARLY 20TH CENTURY**

**Keywords:** artistic and stylistic evolution, art style, current, direction, stage space, theatrical architecture, theatrical facilities, architecture, theater.

**Purpose of the research:** to determine the artistic and stylistic features of the evolution of stage space and theatrical facilities in Belarus of the late sixteenth and early twentieth centuries.

**Research methods**: dissertation work is based on an integrated approach, which is based on the principles of comprehensiveness, historicism and objectivity, which made it possible to consider the stage space and theatrical facilities as an integral complex of interrelated components in the course of artistic and stylistic evolution. The methods of art history analysis, historical, cultural, comparative were also used.

**Obtained results and novelty**. The dissertation is the first in the Belarusian art criticism complex research of stage space and theatrical facilities in the context of artistic and stylistic evolution. In this research work, for the first time, a description was given of the embodiment of the principles of the baroque and rococo styles in the stage space and theater buildings and structures of Belarus, the artistic specificity of classicism in the theater architecture and decorative art was revealed. The concept of stylistic eclecticism in theater art and architecture of the late nineteenth – early twentieth century is substantiated. A new conceptual apparatus has been introduced into scientific use, extensive factual material has been summarized.

**Recommendations for use.** The results of the dissertation research can be used in further research activities in the preparation of special scientific publications, monographs, in the educational process in the development of training courses in specialized secondary and higher educational institutions of artistic profile, in practical activities in the organization of stage space and the creation of theater projects constructions.

**Field of application:** art history, history of Belarusian and world art culture, art education, history of architecture.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Навуковае выданне*

**ПАГОЦКАЯ АЛЕНА ВІКТАРАЎНА**

**МАСТАЦКА-СТЫЛЯВАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ СЦЭНІЧНАЙ ПРАСТОРЫ І ТЭАТРАЛЬНЫХ ЗБУДАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ КАНЦА XVI – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ**

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата мастацтвазнаўства
па спецыяльнасці 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падпісана ў друк 17.05.2019. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Надрукавана на рызографе.
Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. л. 1,74.
Тыраж 60 асобнікаў. Заказ 506.

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
ЛП № 023340/456 от 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.